**Андрэй Екадумаў**

# БЕЛАРУСЬ НА МІЖНАРОДНЫМ РЫНКУ ЎЗБРАЕНЬНЯЎ

Першыя сур’ёзныя скандалы з-за кантролю над распаўсюджваньнем узбраеньняў, у якіх фігураваў афіцыйны Менск, былі зьвязаныя не з самім гандлем, а з выкананьнем міжнародных пагадненьняў аб звычайных узбраеньнях у Эўропе і бязьядравым статусе Беларусі.

У лютым 1995 году Аляксандар Лукашэнка зрабіў публічную заяву пра тое, што Беларусь ня будзе выконваць Дамовы аб скарачэньні звычайных узбраеньняў у Эўропе (СЗУЭ). Гэтая заява тлумачылася беларускімі афіцыйнымі асобамі эканамічнай няздольнасьцю Беларусі дэмантажаваць баявую тэхніку і ўзбраеньні, што было прадугледжана Дамовай. Заява выклікала абурэньне эўрапейскіх дзяржаваў-удзельніцаў Дамовы. Але затым Беларусь усё ж выканала абавязаньні. (9 чэрвеня 2000 году Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі ратыфікавала пагадненьне пра адаптацыю Дамовы аб звычайных Узброеных Сілах у Эўропе. Ад імя Беларусі пагадненьне было падпісана Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам на саміце АБСЭ ў Стамбуле 19 лістапада 1999 году. Адаптаваная Дамова прадугледжвала замену групавых абмежаваньняў, устаноўленых для НАТА і Варшаўскага блёку ў Дамове аб СЗУЭ 1990 году. У новым варыянце гаворка ідзе пра сыстэму гранічных нацыянальных і тэрытарыяльных узроўняў узбраеньняў і тэхнікі для кожнай дзяржавы-ўдзельніцы. Удзел Беларусі ў адаптаванай Дамове не прадугледжвае дадатковага скарачэньня ўзбраеньняў і баявой тэхнікі. Беларусь атрымала права карыстацца мэханізмамі ўзмацненьня групоўкі Ўзброеных сілаў, рэагуючы на магчымыя зьмены вайскова-палітычнай сытуацыі ў рэгіёне. Наша краіна захавала ўсе свае правы, дазволеную колькасьць тэхнікі і ўзбраеньняў і не панесла фінансавых стратаў.)

Улетку 1995 году сталі распаўсюджвацца чуткі аб зрыве графіку вываду ракет СС-25 у Расію. Ракеты павінны былі пакінуць беларускую тэрыторыю да канца 1995 году. На той момант у Беларусі заставалася 18 такіх ракетаў. Было зразумела, што выканаць графік вываду складана нават з чыста тэхнічных прычынаў. Газэта “Известия” надрукавала спасылку на словы Аляксандра Лукашэнкі: маўляў, дзеля таго што Беларусь усё адно мае намер аб’яднацца з Расіяй, ракеты выводзіць ня варта. Улады Беларусі афіцыйна не спраставалі гэтай заявы. Расійскі бок абвінаваціў Беларусь у зрыве выкананьня

дамоўленасьцяў, і ў канцы 1995 году пад ціскам міжнароднай супольнасьці ракеты СС-25 пакінулі беларускую тэрыторыю.

Скандалы, зьвязаныя зь дзейнасьцю Беларусі на рынку ўзбраеньняў, пачынаюцца пасьля 1995 году. 14 чэрвеня 1995 году падчас візыту іранскай дэлегацыі ў Менск была падпісаная Дамова аб вайскова-тэхнічным супрацоўніцтве. Беларусь зьбіралася пастаўляць у Іран звычайныя ўзбраеньні. Апроч таго, пагадненьнем прадугледжвалася магчымасьць рамонту іранскіх танкаў і артылерыйскіх установак на беларускіх прадпрыемствах.

З моманту набыцьця незалежнасьці ў 1991 годзе і да 1996-га, году перамогі Аляксандра Лукашэнкі ў супрацьстаяньні зь Вярхоўным Саветам XIII скліканьня, прысутнасьць Беларусі на міжнародным рынку ўзбраеньняў была нязначнай. Па стане на 1995 год Беларусь не ўваходзіла нават у трыццатку найбуйнейшых прадаўцоў зброі ў сьвеце. Але затым яе становішча на рынку ўзбраеньняў істотна зьмянілася. Паводле зьвестак газэты “Лёс-Анжэлес Таймз”, па аб’ёмах продажу за пэрыяд з 1994 па 1998 год Беларусь уваходзіла ўжо ў лік 15 асноўных экспартэраў зброі ў сьвеце, сярод якіх з краінаў СНД фігуравалі таксама Расія і Украіна. Беларусь пашырала кола імпартэраў зброі, і ў 1998 годзе ўжо шэсьць прадпрыемстваў мелі ліцэнзіі на гандаль узбраеньнямі і вайсковай тэхнікай.

Згодна зь зьвесткамі Расійскага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў (РІСД), яшчэ ў часе рэалізацыі Дамовы СЗУЭ ў 1995 годзе беларускі бок атрымаў права на экспарт 298 танкаў Т-80. У канцы 1998 году гэтыя танкі на ўзбраеньні беларускага войска ўжо не лічыліся. “Нельга выключаць памылкі заходніх аналітыкаў, але зусім верагодна, што Т-80, як і танкі старэйшых тыпаў, маглі быць прададзеныя за мяжу. Прынамсі, у расійскай прэсе прамільгнула інфармацыя пра пастаўкі Беларусяй у КНДР нейкіх танкаў. Праўда, паводле іншых крыніцаў, гэта былі машыны састарэлых мадэляў”[1].

Актывізацыя гандлю ўзбраеньнямі выклікала ўскладненьні ў адносінах Беларусі з галоўным расійскім партнёрам — “Росвооружением”. Для вырашэньня паўсталых праблемаў у сярэдзіне траўня 1998 году Менск наведала дэлегацыя “Росвооружения” на чале зь Яўгенам Ананьевым і яго дарадцам, былым міністрам абароны Паўлам Грачовым. Сьпярша адбылася сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам, потым — зь дзяржсакратаром Рады бясьпекі Віктарам Шэйманам, які прысутнічаў на першай сустрэчы, і прэм’ер-міністрам Сяргеем Лінгам. Паколькі беларускія вайсковыя прадпрыемствы і НДІ ўжо былі часткай адзінага савецкага ВПК, акурат для Расіі, якая ўспадкавала большую частку савецкага ВПК, у першую чаргу і распрацоўваліся прадпрыемствамі Беларусі новыя ўзораў вайсковай тэхнікі. Напрыклад, на МЗКЦ, нягледзячы на канвэрсію, працягваліся работы ў вайсковай галіне. На беларускіх прадпрыемствах рабіліся электронна-аптычныя сыстэмы для танкаў і іншай бранятэхнікі, абсталяваньне для вайскова-марскога флёту, сыстэмы папярэджаньня аб ракетным нападзе і шмат іншага.





Калі верыць зьвесткам Стакгольмскага міжнароднага інстытуту дасьледаваньня праблемаў міру (СМІДПМ), у 1996 годзе Беларусь упершыню ўвайшла ў першую дзясятку экспартэраў узбраеньняў і вайсковай тэхнікі. Акурат з гэтага часу Беларусь выклікае цікавасьць дасьледніцкіх цэнтраў, занятых праблемамі распаўсюджваньня ўзбраеньняў. Прычым ні раней, ні ў гэты час Беларусь сама не выраблялa і не выракляе гатовых узораў узбраеньняў.

Аснову беларускага экспарту скадалі савецкія запасы і кампанэнты прадукцыі вайскова-тэхнічнага прызначэньня беларускай вытворчасьці. Пасьля распаду СССР Беларусь успадкавала запасы ўзбраеньняў, якія засталіся ад Беларускай вайсковай акругі, што лічылася адной з самых баяздольных у Савецкім Саюзе. Значная частка гэтых узбраеньняў і вайсковай маёмасьці мусіла быць скарочаная ў адпаведнасьці з абмежаваньнямі Дамовы па звычайных узброеных сілах у Эўропе. У гэты пералік уваходзілі 2171 адзінка асноўных баявых танкаў, 1420 баявых машын пяхоты і бронетранспартэраў, 167 баявых самалётаў[2]. На думку экспэртаў РІСД, першапачаткова рэалізацыя лішкаў узбраеньня на сусьветным рынку не ўваходзіла ў пляны беларускага кіраўніцтва, бо іх меліся дэмантажаваць і ўтылізаваць. Але затым было пастаноўлена, што прадаваць узбраеньні і баявую тэхніку значна выгадней, чым выдаткоўваць сродкі на яе зьнішчэньне.

“Між тым, — камэнтуе разьвіцьцё сытуацыі аглядальнік “Белорусского рынка” Аляксандар Алесін, — гандаль зброяй аказаўся справай даволі няпростай, найперш у тым пляне, што спарадзіў шэраг сур’ёзных парушэньняў і простых злоўжываньняў як з боку работнікаў Мінабароны, так і начальнікаў на месцах. І ўжо ў 1995 г. былі створаныя спэцыялізаваныя замежнагандлёвыя арганізацыі “Белтехэкспорт”, “Белорусинторг” і “Белвнешпромсервис” з выключным правам рэалізацыі ўзбраеньняў. Годам пазьней пад патранатам Рады бясьпекі пачала працу фірма “Белспецвнештехника”. І, на думку аналітыкаў, акурат у выніку новых падыходаў да экспарту лішкаў узбраеньняў і стварэньня адпаведнага мэханізму адбыўся цямкі рост аб’ёму паставак узбраеньняў зь Беларусі”[3].

Найгучнейшыя і найбольш прыбытковыя кантракты, як лічаць расійскія экспэрты, укладаліся Беларусяй у 1992—1996 гадох. Часьцей за ўсё згадваецца продаж Пэру 150 танкаў Т-72, 16 зьнішчальнікаў МіГ-29С і 2 МіГ-29УБ з камплектам запчастак і наземнага абсталяваньня на суму 385 млн. USD, 12 штурмавікоў Су-25 і 10 ЗРК (“Аса” альбо “Страла”). Менш вядомыя пастаўкі адзінкавых партыяў па 100 танкаў Т-72, а таксама авіябомбаў ФАБ-500 і ФАБ-1500 Вугоршчыне і Чэхіі. Адзінкавыя згадкі пратачыліся ў прэсу наконт продажу Беларусяй 10 тыс. аўтаматаў АКМ і боепрыпасаў да іх (а таксама, магчыма, і ракетаў клясы “зямля — паветра”) Судану і невялікай колькасьці стралковага ўзбраеньня і боепрыпасаў Емэну. Таксама ў замежных СМІ ўзгадваліся пастаўкі на пачатку 1999 году 7 БМП-1, некалькіх адзінак установак залпавага агню “Град” (па некаторых крыніцах — “Сьмерч”), боепрыпасаў для артылерыі і стралковай зброі (агульны кошт кантракту — 1,4 млн. USD) у Анголу, продаж

двух палявых вайсковых трубаправодаў і сродкаў іх транспартаваньня на базе аўташасі “КрАЗ” (агульны кошт кантракту — 300 тыс. USD) Кітаю[4].

Да нядаўняга часу адно зь першых месцаў сярод пакупнікоў узбраеньняў у Беларусі належала Рэспубліцы Пэру. З 1996 году, а паводле некаторых зьвестак — яшчэ раней, Ліма закупіла ў Беларусі 150 танкаў Т-72, каля дзесяці самаходных зэнітных гарматна-ракетных комплексаў “Тунгуска” і “Тор”, прызначаных для зьнішчэньня паветраных цэляў на малых і сярэдніх вышынях (SA-19 Grizon і SA-15 Gauntlet у абазначэньні НАТА), 18 франтавых зьнішчальнікаў МіГ-29 (Fulkram) і столькі ж штурмавікоў Су-25 (Frogfoot) разам з кіраванымі ракетамі клясы “паветра — паветра” Р-27, Р-60, Р-73, 80-мм некіраванымі снарадамі і запальнымі авіябомбамі, а таксама сродкамі наземнага кантролю.

Акурат пастаўкі ў Пэру былых савецкіх баявых самалётаў выклікалі потым скандал, які агудзіў Беларусь на ўвесь сьвет. Калі інфармацыя пра закупкі Пэру беларускай вайсковай тэхнікі для ВПС трапіла ў друк, у Паўднёвай Амэрыцы выбухнуў дыпляматычны скандал. Паміж Пэру і Эквадорам існуе трывалая тэрытарыяльная спрэчка, якая пэрыядычна выклікае лякальныя баявыя дзеяньні. Апошняе ўзброенае сутыкненьне паміж Пэру і Эквадорам адбылося ў 1995 годзе. Ад 1996 году, паводле розных крыніцаў, Пэру закупіла ў Беларусі ад 12 да 21 зьнішчальнікаў МіГ, ад 14 да 18 штурмавікоў Су-25, а таксама сыстэмы супрацьпаветранай абароны. Агульны кошт кантрактаў толькі на пастаўкі МіГаў зь Беларусі ды запасных частак да іх з Расіі набліжаецца да 1 млрд. USD.

18 жніўня 1999 году на прэс-канфэрэнцыі новага генэральнага дырэктара кампаніі “Росвооружение” было абвешчана пра падпісаньне кантракту на пастаўку ў Беларусь 8 зьнішчальнікаў МіГ-29УБ, кошт кантракту не агучваўся. На думку экспэртаў расійскага Цэнтру аналізу стратэгіяў і тэхналёгіяў, гэтыя самалёты набываліся Беларусяй у Расіі з мэтай наступнага перапродажу ў Альжыр у рамках кантракту на пастаўку 36 МіГ-29. Інфармацыя пра гэты кантракт была ўпершыню абнародаваная Лёнданскім інстытутам стратэгічных дасьледаваньняў у 1998 годзе. У той жа час шэраг экспэртаў мяркуюць, што сам факт куплі буйной партыі вучэбна-баявых самалётаў можа ўскосна сьведчыць, што агульная колькасьць зьнішчальнікаў, прададзеных Беларусяй у Алжыр, значна большая, прыблізна 64, бо звычайна суадносіны вучэбна-баявых і баявых самалётаў складаюць 1:8.

Нягледзячы на супрацоўніцтва з Расіяй, значную колькасьць беларускіх кантрактаў не ўдалося давесьці да канца з-за вострай канкурэнцыі з боку іншых былых савецкіх рэспублік. Напрыклад, у 1995 годзе Індыя плянавала закупку ў Беларусі 12 баявых верталётаў Мі-35 (экспартная вэрсія Мі-24), якія даволі доўга былі ў эксплюатацыі, укамплектаваных штатным ракетным узбраеньнем і запаснымі часткамі. Кошт кожнай машыны быў вызначаны ў 1 млн. USD. Перадпродажны рамонт верталётаў меркавалася правесьці на Аршанскім авіярамонтным заводзе. Але гэты кантракт так і ня быў завершаны. Індыя падпісала пагадненьне з расійскай кампаніяй “Росвертол”, якая прадстаўляла інтарэсы





вытворцы і ажыцьцяўляла фірмовую перадпродажную падрыхтоўку тэхнікі й яе далейшае абслугоўваньне.

Хоць старыя савецкія запасы і дазволілі Беларусі зрабіць рывок на рынку ўзбраеньняў, весьці цалкам самастойную палітыку на гэтым рынку ёй не пад сілу. Да 2000 году запасы ўзбраеньняў, што дасталіся ад СССР і распрадаваліся зь сярэдзіны 1990-х, скончыліся. Цяпер, калі Беларусь практычна вычарпала запасы ўзбраенняў і вайсковай тэхнікі, здольных зацікавіць патэнцыйных пакупнікоў, аб’ёмы валютных паступленьняў ад іх продажу рэзка ўпалі.

Беларускія гандляры зброяй актыўна асвойваюць пастаўкі запасных частак да прададзенай калісь савецкай зброі ды баявой тэхнікі, але гэтыя даходы несувымерныя з ранейшымі. Таму калі ў нейкай галіне і магчыма шчыльнае расійска-беларускае супрацоўніцтва, то гэта каапэрацыя ў распрацоўцы і вытворчасьці ўзбраеньняў. Найбольшую цікавасьць для Расіі ўяўляюць магчымасьці беларускага ВПК па капітальным рамонце і мадэрнізацыі вайсковай тэхнікі, у тым ліку самалётаў Су-22, Су-25, Су-27, МіГ-29, верталётаў Мі-8 і Мі-17, баявых машынаў пяхоты БМП-1 і БМП-2, бронетранспартэраў БТР-60 і БТР-70, сыстэмаў СПА С-300В, сродкаў сувязі і АСУ, аўтамабільнай і інжынэрнай тэхнікі.

Беларусь можа самастойна ствараць і экспартаваць прадукцыю вайсковага прызначэньня. Гэта велікагрузныя аўтамабільныя шасі для разьмяшчэньня шырокага набору ўзбраеньняў, оптаэлектронныя сыстэмы назіраньня і кіраваньня агнём, аўтаматызаваныя сыстэмы кіраваньня зброяй і войскамі.

Развіцьцё вайсковых прадпрыемстваў Беларусі ў першую чаргу залежыць ад разьвіцьця расійскага ВПК, асноўнага спажыўца кампанэнтаў вырабаў вайскова прызначэньня, якія выпрабляюцца Беларусяй.

Пасьля распаду СССР былыя рэспублікі атрымалі пакінутыя ім часткі адзінага вайскова-прамысловага комплексу СССР. Расія займела асноўную долю савецкага ВПК і, пры наяўнасьці неабходных сродкаў, захавала здольнасьць вырабляць любыя віды ўзбраеньняў. Акурат расійскія вытворцы валодаюць асноўнымі правамі на савецкія вайсковыя распрацоўкі. Рэспублікам СНД, якія прадаюць зброю з савецкага запасу, патрэбна падтрымка Расіі. У часе візыту ў Маскву ўзімку 2001 году, у рамках правядзеньня Дзён беларускай культуры ў Расіі, Аляксандар Лукашэнка заклікаў Расію аб’яднаць намаганьні ў вытворчасьці і продажы ўзбраеньняў.

Хаця беларускі рэжым выклікае незадавальненьне цывілізаванага сьвету, бесьпярэчныя довады парушэньняў пагадненьняў у галіне гандлю зброяй да сёньня не былі апублікаваныя. Разам з тым супрацоўніцтва Беларусі з краінамі-ізгоямі сусьветнай супольнасьці стварае спрыяльную глебу для скандалаў, зьвязаных з пастаўкамі ў гэтыя краіны.

17 лютага 1998 году “The Washington Times” надрукавала артыкул “Беларусь і Іран плянуюць падпісаць пагадненьне пра продаж зброі”. Газэта спасылалася на зьвесткі ЦРУ пра меркаванае падпісаньне пагадненьня Беларусі з Іранам, якое прадугледжвала продаж танкавых рухавікоў і запасных частак, а таксама

акрэсьлівала планы будаўніцтва танкарамонтнага заводу.

Беларускае МЗС выступіла зь зьняпраўджаньнем паведамленьняў, якія зьявіліся ў шэрагу заходніх СМІ, пра нібыта меркаванае падпісаньне беларуска-іранскага пагадненьня аб вайскова-тэхнічным супрацоўніцтве. Афіцыйны Менск таксама адкінуў закіды ў магчымасьці перадачы Тэгерану ракетнай і ядравай тэхналёгіі й заявіў пра строгае датрыманьне абавязаньняў, узятых Беларусяй на сябе згодна з Дамовай аб нераспаўсюджваньні ядравай зброі й іншымі міжнароднымі пагадненьнямі ў абсягу раззбраеньня і кантролю над узбраеньнямі.

Падставай для падозраньняў Беларусі магла стаць сакрэтнасьць беларуска-іранскіх перамоваў аб супрацоўніцтве ў вайсковай сфэры. Як пракамэнтавала скандал газэта “Белорусский рынок”, “пастаўкі Ірану запчастак і тэхналёгіяў для рамонту ягонага моцна састарэлага танкавага парку — далёка не найвялікшы “грэх”, асабліва на фоне будаўніцтва Расіяй у Іране двух ядравых рэактараў, паставак Тэгерану найноўшых узбраеньняў і вайсковай тэхнікі зь Нямеччыны, Кітаю і ўсё той жа Расіі. Дарэчы, і сама “The Washington Times” заклапочаная ня столькі пагрозай мадэрнізацыі іранскіх танкаў, колькі гэтай самай сакрэтнасьцю, якая, як піша газэта, “можа адкрыць перад Беларусяй шлях да продажу іншай вайсковай тэхнікі, напрыклад, ракетных транспартэраў”[5].

Артыкул “The Washington Times” канчаўся засьцярогай, што “апарат Рады бясьпекі Белага дому і асабіста Строўб Тэлбот, цяперашні намесьнік дзяржсакратара ЗША, не маглі забясьпечыць беларускіх дэмакратаў-рэфарматараў неабходнай амэрыканскай эканамічнай і тэхнічнай дапамогай у вырашальны пэрыяд на пачатку 1990-х гадоў”. Замест гэтага, пісала газэта, 200 млн. USD было аддадзена на падтрымку ў Беларусі аджылай савецкай калгаснай сыстэмы, з-за чаго дэмакраты-рэфарматары былі выцесьненыя з урадавых колаў Беларусі. Калі гэтае меркаваньне слушнае, адміністрацыя Клінтана непазьбежна павінна будзе ўзмацніць жорсткасьць стаўленьня да Менску”[6].

Скандалы ўзьнікалі і ў сувязі зь незаконнымі апэрацыямі на тэрыторыі СНД. У чэрвені 1999 году агенцтва БелаПАН паведаміла пра расьсьледаваньне Беларускай вайсковай пракуратурай крымінальнай справы, узбуджанай па факце выяўленьня на тэрыторыі беларускага вайсковага палігону ўва Ўруччы шасьці рэактыўных рухавікоў для зьнішчальнікаў МіГ-29. Сьледзтва ўстанавіла, што ў 1995 годзе злачыннай групай, у якую ўваходзілі былыя работнікі КДБ СССР і штабу вайскова-паветраных сілаў, у Расіі было скрадзена авіяцыйнае абсталяваньне на суму ў некалькі мільярдаў USD. Рухавікі для баявых самалётаў коштам 2 млн. USD кожны прызначаліся для адпраўкі ў Альжыр і Паўночную Карэю. Беларусь у гэтых пастаўках выступала ў якасьці транзытнага пункту. Рухавікі даставілі ў Менск зь Берасьцейскай вобласьці, і па дакумэнтах яны праходзілі як рухавікі для самалётаў цывільнай авіяцыі[7].

У 2001 годзе ў “Нью-Йорк Таймз” зьявілася інфармацыя пра пастаўкі Беларусяй у Ірак прадукцыі падвойнага прызначэньня — станкоў для вырабу аптычных лінзаў і наразаньня дыямэнтаў. У 1996—1998 гадох Беларусь ажыцьцявіла з Іракам сумнеўны, з пункту погляду камісіі па бясьпецы ААН, кантракт. Станкі для вырабу аптычных лінзаў можна выкарыстоўваць і для вытворчасьці аптычных прыцэлаў, таму для ажыцьцяўленьня гэтага пагадненьня патрабаваліся доўгія ўзгадненьні ў рамках ААН, а ў гэтым выпадку працэдура не была належным чынам выкананая. Паводле інфармацыі “Белорусской деловой газеты”, зь беларускага боку пагадненьне ажыцьцяўляла, хутчэй за ўсё, фірма “Белтехэкспорт” на чале з Уладзімерам Пефціевым. Фірма спэцыялізавалася на пастаўках узбраеньняў у розныя краіны сьвету і ў сярэдзіне 1990-х даволі актыўна дзейнічала на ірацкім рынку, калі Ірак набыў буйную партыю станкоў для вытворчасьці аптычных лінзаў у Беларусі й Расіі.

Кіраўнік кампаніі “ЛАДА-ОМС” Аляксей Ваганаў паведаміў, што на ірацкім рынку працуюць дзьве беларускія кампаніі — “ЛАДА-ОМС” і “Белметаллэнерго”. “І мы, і нашыя партнэры працуем у строгай адпаведнасьці з санкцыямі ААН. Ірацкі рынак і так дастаткова выгадны. Ніхто цяпер ня стане парушаць санкцыі, рызыкуючы страціць гэты рынак… дзіўна, што пра ўсю гэту гісторыю вырашылі згадаць акурат цяпер. Калі верыць газэце, угода адбылася ў сярэдзіне 90-х гадоў”[8]. Аснову беларускага экспарту ў Ірак складае прадукцыя машынабудаваньня: трактары, цяжкія аўтамабілі, будаўнічая тэхніка.

Уладзімер Замяталін, тагачасны кіраўнік беларуска-ірацкай гандлёва-эканамічнай камісіі, заявіў, што зварот да тэмы продажу станкоў справакаваны канкурэнтамі Беларусі на ірацкім рынку: “Размова ідзе пра пэрспэктывы супрацоўніцтва з Іракам. Зьняцьце санкцыяў з гэтай краіны ўсё адно непазьбежнае. Таму цалкам натуральнае жаданьне некаторых эканамічных структураў скампрамэтаваць краіну, якая займае на ірацкім рынку даволі трывалае становішча. Разьлік ідзе на тое, што мы гэты рынак згубім, і наша ніша будзе адразу ж занятая іншымі”[9].

Да гэтага часу афіцыйны Менск асабліва не хаваў сваёй прысутнасьці на рынку ўзбраеньняў. На II Усебеларускім сходзе Аляксандар Лукашэнка заявіў, што даходы ад гандлю зброяй — адна з істотных крыніцаў падтрыманьня стабільнасьці палітычнага рэжыму ў Беларусі. Кантракты на пастаўку ўзбраеньняў, аказаньне паслуг па рамонце і мадэрнізацыі, выкананых беларускімі пасярэдніцкімі фірмамі, былі ўкладзеныя на сотні мільёнаў даляраў. Частка грошай, выручаных на сусьветным рынку ўзбраеньняў, выкарыстоўваецца для вяртаньня ўкладаў насельніцтва ў Ашчадным банку СССР[10].

Цікавасьць Захаду да ўдзелу Беларусі ў гандлі зброяй прыкметна ўзрасла ў канцы 2001 году, калі былі апублікаваныя вынікі дасьледаваньняў некалькіх заходніх інстытутаў. У сярэдзіне студзеня 2002 году дасьледчы інстытут пры ВПС ЗША “Jane’s Informational Group” у сваіх дасьледаваньнях назваў Беларусь найбуйнейшай пастаўніцай узбраеньняў для ісламскіх экстрэмістаў. Згодна з абнародаванымі зьвесткамі, толькі за першую палову 2001 году Беларусь прадала зброі агульным коштам паўмільярда USD. “Jane’s Informational Group” абві-

навацію Беларусь у пастаўках зброі ў Ірак і Палестыну праз складаны ланцужок пасярэднікаў, у ліку якіх называюцца Грузія, Турцыя, Сырыя, Іярданія і Малдова.

Беларускае міністэрства замежных справаў і Міністэрства абароны спраставалі абвінавачаньні. Кіраўнік прэс-цэнтру Рады бясьпекі Рэспублікі Беларусі Сяргей Верашчак адзначыў, што такія чуткі зьяўляліся неаднойчы і “калі б такія зьвесткі сапраўды былі атрыманыя адной з заходніх выведак, гэта ўжо даўно абмяркоўвалася б на ўзроўні МЗС і кіраўнікоў дзяржаваў. Рэспубліка Беларусь, як і шмат якія іншыя дзяржавы, сапраўды гандлюе зброяй, але робіць гэта ў строгай адпаведнасьці зь міжнародным заканадаўствам у гэтай дзялянцы”[11].

“Між тым, — адзначала “Белорусская деловая газета” ў траўні 2001 г., — нават паводле афіцыйных зьвестак Беларусь уваходзіць у дзясятку найбуйнейшых сусьветных пастаўнікоў узбраеньняў. Прыбыткі ад іх продажу ідуць у спэцыяльны фонд прэзыдэнта краіны і ня ўлічваюцца пры фармаваньні дзяржаўнага бюджэту. Леташняя спроба некаторых дэпутатаў уключыць паступленьні ад продажу зброі ў бюджэт посьпеху ня мела і не была падтрыманая ні Міністэрствам фінансаў, ні Міністэрствам абароны. Прычым гэта нічым не матывавалася”[12].

Паводле зьвестак СМІДПМ, у 1998 годзе Беларусь прадала праз Малдову 8 БТР-80 у Анголу. У 1996—1998 гадох, паводле зьвестак таго ж інстытуту, Беларусь пастаўляла ўзбраеньні Іраку праз Сырыю і Іярданію, першыя пастаўкі ўзбраеньняў у Палестыну адбываліся ў 2000—2001 гадох. Асабліва актыўна, калі верыць гэтым паведамленьням, Беларусь супрацоўнічала з Пакістанам, які закупіў з 1996 па 1999 год 5760 адзінак сыстэмаў навядзеньня для супрацьтанкавых ракетаў. Буйныя пастаўкі ўзбраеньняў нібыта ажыцьцяўляліся ў ваюючую Югаславію, а транспарт агульнай вагой у 13 тонаў, які ішоў туды ў 2000 годзе, быў затрыманы італьянскай паліцыяй. Агульны аб’ём беларускага экспарту ўзбраеньняў у 1996—2000 гадох СМІДПМ ацаніў у 1,2 млрд. USD. Калі ў 1996 годзе было прададзена ўзбраеньня на суму 113 млн. USD, то ў 2000 годзе — ужо 498 млн. USD. А ў 2001 годзе, паводле ацэнкі, аб’ёмы гандлю ўзбраеньнямі і, адпаведна, прыбыткі ад гэтага гандлю ўзрасьлі ці ня ў два разы.

Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусі расцаніла абвінавачаньні як выключна палітычныя, а кампанію выкрыцьцяў зьвязала з разглядам беларускага пытаньня на сэсіі парлямэнцкай асамблеі АБСЭ і агульным зьмякчэньнем пазыцыі Захаду да Беларусі.

На пачатку вясны 2001 году агенцтва БелаПАН са спасылкай на расійскае Агенцтва вайсковых навінаў (АВН) надрукавала зьвесткі пра пастаўку Беларусяй у Марока 48 мадэрнізаваных танкаў Т-72, а таксама вялікай колькасьці запчастак да іх. У якасьці крыніцы зьвестак у паведамленьні фігуравала дырэкцыя 140-га танкарамонтнага заводу ў Барысаве, дзе нібыта й ішлі работы па падрыхтоўцы баявой тэхнікі да продажу. Раней машыны знаходзіліся на доўгатэрміновым захоўваньні.





У паведамленьні АВН прыводзілася неафіцыйная інфармацыя пра прыблізны кошт кантракту. Агульны прыбытак беларускага боку ад продажу танкаў і запчастак ацэньваўся прыблізна ў 10—12 млн. USD., г.зн. у сярэднім кожны танк Т-72 быў прададзены Марока прыблізна за 250 тыс. USD. Калі браць пад увагу акурат такую суму, то баявая тэхніка прадавалася даволі танна.

У ліпені 2001 году ізраільскім карэспандэнтам расійскага інтэрнэт-рэсурсу “ПРЕСС-ЦЕНТР.РУ” Кірылам Глузманам зь нейкіх кампэтэнтных крыніцаў Ізраілю была атрыманая інфармацыя пра беларускія пастаўкі зброі палестынскім экстрэмістам[13]. Згодна з інфармацыяй, палестынцы сталі радзей выкарыстоўваць для абстрэлаў ізраільскага войска мінамёты ўласнай вытворчасьці й перайшлі на імпартныя. Перахопленая буйная партыя мінамётаў дазволіла рэканструяваць ланцужок “вытворца — пакупнік”. Па ацэнках ізраільскіх і эўрапейскіх спэцыялістаў па гандлі зброяй, Беларусь сталася найбуйнейшай пастаўніцай зброі і боепрыпасаў мусульманскім экстрэмістам на Блізкім Усходзе і Балканах. Скарыстаўшыся са спыненьня агню паміж Ізраілем і Палестынскай аўтаноміяй, палестынцы закупілі ў Беларусі вялікую колькасьць 120-мм мінамётаў і снарадаў да іх, супрацьтанкавых і супрацьпаветраных ракетаў, аўтаматычнай зброі і боепрыпасаў. Толькі за 6 месяцаў да зьяўленьня гэтай інфармацыі Беларусь уклала кантракты на продаж зброі арабскім краінам, палестынцам і альбанскім баевікам. Ірацкія ВПС закуплялі ў Беларусі радарна-лякацыйныя станцыі, мадэрнізаваныя сродкі СПА і абсталяваньне сувязі, якое дазволіла павысіць эфэктыўнасьць ірацкіх ВПС і СПА. Абсталяваньне трапляла ў Ірак кантрабандай і мантажавалася на месцы беларускімі спэцыялістамі.

27 ліпеня 2001 году МЗС Рэспублікі Беларусі спраставала гэтую інфармацыю.

Улічваючы, што на момант скандалу Беларусь ужо не валодала вялікімі арсэналамі зброі, экспэрт “Белорусского рынка” Аляксандар Алесін так пракамэнтаваў апэратыўную рэакцыю беларускага МЗС: “Аналіз зьвестак міжнародных дасьледчых цэнтраў пра экспарт зь Беларусі ўзбраеньняў і вайсковай тэхнікі ў пэрыяд з 1993 па 2000 гг. дазваляе нам сьцьвярджаць, што публікацыя ў “Народнай волі” не зусім адпавядае рэчаіснасьці”[14].

Асаблівы інтарэс у сьвятле ўзмацненьня барацьбы з сусьветным тэрарызмам выклікаюць скандалы, зьвязаныя зь беларуска-ірацкім вайсковым супрацоўніцтвам, найперш ува ўдасканаленьні супрацьпаветранай абароны Іраку. Варта, аднак, зацеміць, што крыніцы ў ЗША і Ангельшчыне, чые ВПС патрулююць паветраную прастору Іраку, не пацьвердзілі ўдзелу Беларусі ў мадэрнізацыі ірацкай сыстэмы СПА, хаця і паведамлялі пра ўдзел у мадэрнізацыі такіх сыстэм у іншых краінах, у прыватнасьці ў Кітаі і Югаславіі. Г.зн. калі Беларусь і займалася незаконнымі пастаўкамі ў Ірак, то не наўпрост, а праз трэція краіны, у адносінах да якіх ня дзейнічаюць міжнародныя санкцыі, і давесьці яе прыналежнасьць да падтрымкі сусьветнага тэрарызму надзвычай складана.

Шэраг аналітыкаў падзяляюць вэрсію аб тым, што інфармацыйная кампанія

супраць беларускага гандлю зброяй — свайго роду папераджальны ход спэцслужбаў Ізраілю з мэтай зашкодзіць перадачы высокіх тэхналёгіяў мусульманскім краінам, што суседзяць з Ізраілем. Гэты варыянт падаецца верагодным: незадоўга да скандалу ФПГ “Абарончыя сыстэмы” быў укладзены кантракт на глыбокую мадэрнізацыю 60 эгіпецкіх зэнітна-ракетных комплексаў “Пячора”. У ліку асноўных выканаўцаў замовы былі беларускія прадпрыемствы. Тым больш што інфармацыйная акцыя праходзіла перад прэзыдэнцкімі выбарамі ў Беларусі, што змушала беларускія ўлады ўважлівей ставіцца да думкі міжнароднай супольнасьці.

Пры канцы 2001 году пачалася інфармацыйная кампанія, нацэленая на высьвятленьне сытуацыі з магчымымі пастаўкамі беларускай зброі ў арабскія дзяржавы. Нямецкае агенцтва ДПА распаўсюдзіла паведамленьне пра тое, што ў найбліжэйшы час Беларусь зьбіраецца ажыцьцявіць буйныя пастаўкі зброі ў Палестыну, Альбанію і нейкія арабскія дзяржавы. У паведамленьні гаварылася, што агульная сума кантрактаў складае 500 млн. USD. Беларусь назвалі найбуйнейшай пастаўніцай зброі тэрарыстычным арганізацыям гэтых дзяржаваў.

Паведамленьне нямецкай агенцыі было з інтарэсам сустрэтае замежнымі СМІ, бо кіраўніцтва Беларусі да гэтага часу надта часта выказвала зацікаўленьне да “праблемных” дзяржаваў. Беларусь цесна супрацоўнічала з Іракам, пастаўляючы трактары, прычэпы і паўпрычэпы, а таксама запчасткі й абсталяваньне да іх і да рухавікоў унутранага згараньня, шыны. Міністэрствам гандлю Іраку ў 2001 годзе ў якасьці афіцыйных экспартэраў зарэгістравана каля 40 беларускіх прадпрыемстваў, 4 беларускія прадпрыемствы зарэгістраваныя ў якасьці пакупнікоў іракскай нафты[15]. У канцы лютага 2001 году прэзыдэнт Лукашэнка раней за новапрызначанага пасла ЗША прыняў пасла Іраку Зайфа Абдулмажыда Ахмэда. А праз некалькі дзён пасьля тэрарыстычнай атакі на Нью-Ёрк Лукашэнка сустракаўся з вайсковай дэлегацыяй Лібійскай Джамахірыі.

Крыніцы нямецкай агенцыі спасылаліся на вынікі расьсьледаваньня ці то ЦРУ, ці то Рады бясьпекі ААН. Падставай для гэтага расьсьледаваньня былі нібыта ранейшыя беларускія пастаўкі зброі ў Ірак, якія ажыцьцяўляліся ў абход санцыяў ААН праз нейкую трэцюю краіну, магчыма праз Сырыю. Прэс-сакратар МЗС Беларусі Павел Латушка заявіў, што такія паведамленьні ня маюць пад сабой рэальнага грунту і беларускае МЗС ня будзе іх камэнтаваць. Такую самую рэакцыю выказала беларускае пасольства ў Іраку.

Ня выключана, што інфармацыя пра незаконны гандаль Беларусі з Іракам распаўсюджвалася расійскімі канкурэнтамі беларускіх кампаніяў, што працуюць на іракскім рынку, дзеля зрыву буйнога кантракту на пастаўкі беларускіх аўтамабіляў у гэтую краіну.

Пры канцы 2001 году ў Варшаве адбылася міжнародная канфэрэнцыя ў пытаньнях бясьпекі і барацьбы з тэрарызмам, на якой ад Беларусі прысутнічаў кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Ўрал Латыпаў. Віцэ-міністар Марак Сівец, кіраўнік бюро дзяржаўнай бясьпекі канцылярыі прэзыдэнта Польшчы, заявіў:





“Калі мы гаворым пра такую надзвычай важную справу, як барацьба з тэрарызмам у рэгіёне Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, то нельга пакідаць “дзірку” альбо “чорную пляму”, што завецца Беларусяй”[16]. Заява Марака Сіўца па Беларусі робіць зразумелым, чаму акурат Беларусь становіцца зручнай мішэняй для падобных інвэктываў. Тэракты 11 верасьня ў Амэрыцы абвастрылі ўвагу міжнароднай супольнасьці да паставак зброі ў праблемныя краіны.

Падчас правядзеньня 56-й сэсіі Генэральнай Асамблеі ААН у верасьні 2001 году сярод сяброў Рады Бясьпекі былі распаўсюджаныя дакумэнты зь зьвесткамі пра дзейнасьць беларускіх фірмаў на міжнародным рынку ўзбраеньняў і пра іх пастаўкі ў краіны, якія падазраюцца ў дапамозе міжнароднаму тэрарызму.

У адказ на гэта МЗС Беларусі сьцьвердзіў, што гандаль зброяй у абход санкцыяў ААН немагчымы. Як заявіў карэспандэнту “Белорусской деловой газеты” прадстаўнік гэтагай ведамства, “нават калі б мы захацелі прадаваць зброю ў Ірак ці Палестыну, гэта нерэальна зрабіць з-за існай жорсткай і разгалінаванай сыстэмы экспартнага кантролю. Усе пастаўкі ажыцьцяўляюцца ў рамках санкцыяў ААН. Іншая рэч, што мы ня ў стане потым пракантраляваць, што робіць з гэтым узбраеньнем пакупнік. Таму нельга выключаць, што хтосьці затым перапрадае зброю, набытую ў беларускіх пастаўнікоў. Але гэта не азначае, што зброю прадае наша краіна”[17].

Паралельна з узмацненьнем антыіракцкай рыторыкі ў ЗША і распаўсюджваньнем паведамленьняў пра імавернасьць вайсковае апэрацыі супраць Багдаду ў заходніх СМІ ўсё большая ўвага стала надавацца меркаванаму продажу Іраку Ўкраінай і Беларусяй сыстэмаў СПА. Такія сыстэмы могуць зьбіваць амэрыканскія і брытанскія вайсковыя самалёты, якія патрулююць забароненыя для палётаў зоны ў Іраку, а таксама выкарыстоўвацца падчас імаверных вайсковых дзеяньняў у будучыні. Усё часьцей стала выказвацца думка, што Беларусь і Ўкраіна ў парушэньне санкцыяў ААН прадалі Садаму Хусэйну зэнітныя сыстэмы й навучалі іракскіх вайскоўцаў карыстацца гэтай зброяй. У сувязі з абвінавачаньнямі ў пастаўках зброі Дзяржаўны дэпартамэнт ЗША заявіў пра магчымае ўвядзеньне санкцыяў супраць Беларусі.

З 16 па 22 лютага 2002 году ЗША праяўлялі беспрэцэдэнтную актыўнасьць што да Беларусі. 16 лютага 2002 году ў Менск прыляцела дэлегацыя кангрэсмэнаў з ЗША на чале зь сябрам камітэту па бясьпецы амэрыканскага парлямэнту Джэймсам Сэкстанам. Тры кангрэсмэны ЗША — Джэймс Сэкстан, Бэрнард Сандэрс і Рональд Льюіс — сустрэліся зь міністрам замежных справаў Рэспублікі Беларусі Міхаілам Хвастовым, міністрам абароны Леанідам Мальцавым і сакратаром Рады бясьпекі Генадзем Нявыгласам. Амэрыканская дэлегацыя заклікала беларускае кіраўніцтва зрабіць сыстэму гандлем зброі, у прыватнасьці яе фінансавы бок, празрыстымі, бо толькі так можна перашкодзіць продажу ўзбраеньняў тэрарыстам — наўпрост ці праз пасярэднікаў.

Візыт групы кангрэсмэнаў прадэманстраваў занепакоенасьць Злучаных Штатаў шматлікімі сьведчаньнямі розных крыніцаў пра гандаль Беларусяй зброяй зь

дзяржавамі і асобамі, якія падтрымліваюць тэрарызм, і, магчыма, падрыхтоўку вайсковых спэцыялістаў для гэтых краінаў або групаў. Камэнтуючы візыт дэлегацыі Палаты прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША, міністар замежных спраў Рэспублікі Беларусі Міхаіл Хвастоў паведаміў, што Беларусь строга трымаецца пастановаў Рады Бясьпекі ААН. Міністар абароны Рэспублікі Беларусі Леанід Мальцаў заявіў, што Беларусь — сувэрэнная дзяржава і пытаньне, з кім нам гандляваць зброяй, вырашаць беларускаму боку. 19 лютага Аляксандар Лукашэнка ў інтэрвію амэрыканскай газэце "Ўол Стрыт Джорнал" спраставаў публікацыі ў заходніх СМІ пра продаж Беларусяй зброі ў абход санкцыяў ААН.

21 лютага Менск наведаў памочнік дзяржаўнага сакратара ЗША Стывэн Пайфэр, які паведаміў, што ЗША гатовыя ўжыць жорсткія захады да Беларусі, калі інфармацыя пра незаконны гандаль узбраеньнем спраўдзіцца. Стывэн Пайфэр, адведаўшы Менск, выказаў занепакоенасьць ЗША зьвесткамі пра тое, што частка беларускага зброевага экспарту ў парушэньне санкцыяў ААН апынаецца ў руках тэрарыстаў або дзяржаваў, якія іх падтрымліваюць. Вашынгтон непакоіцца, што Багдад можа спрацаваць хімічную, біялягічную або ядравую зброю і затым, магчыма, перадаць яе ісламскім тэрарыстам для выкарыстаньня супраць ЗША ці іншых заходніх дзяржаваў.

Гаворачы пра імавернасьць наўмысных паставак беларускай зброі тэрарыстычным арганізацыям і краінам-ізгоям, Стывэн Пайфэр заявіў, што ЗША маюць надзейныя зьвесткі пра тое, што ўвосень 2001 году ў Беларусі знаходзіліся вайскоўцы Іраку, якія праходзілі навучаньне на зэнітнай сыстэме С-300, якая выкарыстоўваецца супраць брытанскіх і амэрыканскіх самалётаў, што патрулююць у небе Іраку зоны, забароненыя для палётаў іракцкай авіяцыі. Паводле словаў Стывэна Пайфэра, навучаньне адбывалася пасьля тэрарыстычных актаў 11 верасьня ў ЗША і адпаведнага ўказу прэзыдэнта Буша, згодна зь якім ЗША ня будуць праводзіць розьніцы паміж тэрарыстамі і дзяржавамі, якія ім дапамагаюць. Стывэн Пайфэр адзначыў, што пытаньне падрабязна абмяркоўвалася зь беларускімі афіцыйнымі асобамі — кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта Ўралам Латыпавым, міністрам замежных справаў Міхаілам Хвастовым, міністрам абароны Леанідам Мальцавым. Цягам гэтых сустрэчаў прадстаўнік ЗША заклікаў беларускі бок зрабіць усё магчымае, каб выключыць незаконныя пастаўкі зброі і падрыхтоўку беларускімі вайсковымі спэцыялістамі замежных тэрарыстаў.

У скандал зь незаконнай пастаўкай узбраеньняў апроч Беларусі была ўцягнутая і Ўкраіна. 14 сакавіка ва ўкраінскім парлямэнце на адрас Леаніда Кучмы прагучалі абвінавачаньні ў арганізацыі продажу Іраку сыстэмы СПА С-300 улетку 2000 году. Аляксандар Жыр, які ўжо раней абвінавачваў Кучму ў атрыманьні прыбыткаў ад продажу зброі аўганскаму "Талібану", заявіў, што ён праслухаў запіс размовы Леаніда Кучмы і кіраўніка "Укрспэцэкспарту" Валер'я Малева, дзе яны абмяркоўвалі продаж С-300. Адмінстрацыя прэзыдэнта Леаніда Кучмы назвала заявы Жыра палітычным паклёпам, накіраваным на ўмацаваньне яго-





ных уласных пазыцыяў напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 31 сакавіка 2002 г. Спэцыяліст у праблеме міжнароднай злачыннасьці й супрацоўнік Нацыянальнай рады бясьпекі пры былым прэзыдэнту ЗША Білу Клінтану Лі Валоскі не выключае магчымасьці існаваньня паміж гандлярамі зброяй у Расіі, Беларусі і Ўкраіне пэўных сувязяў. "Мне непрыемна дапускаць, што довады такой змовы ці таемнага пагадненьня сапраўды існуюць, але ёсьць багата ўскосных зьвестак для меркаваньня, што сувязі такога роду вельмі значныя, таму што, калі ў Іраку даводзіцца бачыць новыя сыстэмы СПА расійскай вытворчасьці, складана ўхіліцца ад пытаньня: "Адкуль яны зьявіліся?"[18].

На думку Скота Рытэра, былога інспэктара ААН па ўзбраеньні ў Іраку, незаконныя пастаўкі зброі працягваліся і пасьля ад'езду інспэктараў ААН з Іраку ў 1998 годзе. Дзеля гэтага ўрад Іраку заснаваў шэраг кампаніяў для закупкі зброі ў Ярданіі, Сырыі, Малайзіі ды іншых краінах: "У 1997—1998 гг. да нас даходзілі зьвесткі пра шчыльнае супрацоўніцтва Іраку з урадам Сырыі для выкарыстаньня сырыйскіх сувязяў з вытворцамі ў Беларусі, Украіне і Расіі. Па кантрактах з гэтымі краінамі Сырыя атрымлівала вайсковыя тэхналёгіі, абсталяваньне, тэхніку, а потым таемна "дзялілася" з Іракам. Хусэйн расплачваўся нафтай"[19].

Беларускае МЗС накіравала ў пасольствы ЗША, Рэспублікі Польшчы й Ізраілю ноту з пратэстам супраць абнародаваньня СМІ гэтых дзяржаваў матэрыялаў, якія абвінавачваюць Беларусь у незаконным гандлі зброяй.

27 лютага Дзяржаўны дэпартамэнт ЗША паведаміў пра гатоўнасьць увесьці санкцыі супраць Беларусі, калі факты паставак продажу зброі пацьвердзяцца. Пазыцыя ЗША ў пытаньні беларускага гандлю зброяй выказаная афіцыйным прадстаўніком Белага дому Рычардам Баўчэрам: "ЗША вельмі сур'ёзна ўспрымаюць інфармацыю аб продажы зброі тым краінам і групам, якія падтрымліваюць тэрарызм. Мы заўсёды выкарыстоўваем самыя розныя спосабы арганізацыі ўзаемаадносінаў з такімі краінамі — ад двухбаковых перамоваў да ўвядзеньня санкцыяў з мэтай прадухіленьня продажу зброі… Намесьнік дзяржсакратара… давёў да ведама беларускага кіраўніцтва пазыцыю ЗША. Беларусь павінна адразу ж спыніць пастаўкі ўзбраеньняў краінам з багатай тэрарыстычный гісторыяй і краінам, якія распальваюць рэгіянальныя канфлікты"[20]. Прэс-сакратар МЗС Беларусі Павел Латушка заявіў, што "ніякіх фактаў, якія пацьвярджалі б незаконны гандаль Беларусяй зброяй, нам не было прадастаўлена ні падчас візыту дэлегацыі Кангрэсу ЗША, ні падчас знаходжаньня ў нашай краіне прадстаўнікоў Дзярждэпартамэнту ЗША, і нам няма ў чым апраўдвацца. Што датычыць камэнтару прэс-сакратара Дзярждэпартамэнту ЗША Рычарда Баўчэра… лепш зьвярнуцца з гэтым пытаньнем да пасла ЗША ў Беларусі Майкла Козака, які прымаў удзел ува ўсіх сустрэчах прадстаўнікоў Кангрэсу і Дзярждэпартамэнту ЗША з афіцыйнымі асобамі Беларусі. Мы яшчэ раз падкрэсьліваем, што Беларусь ніколі не гандлявала, не гандлюе і не пляную гандляваць зброяй у абход санкцыяў Рады Бясьпекі ААН ці зь дзяржавамі, якія заўважаныя ў падтрымцы тэрарыстаў"[21].

Сяргей Лінг, прадстаўнік Беларусі ў ААН, катэгарычна зьняпраўдзіў факт паставак зброі краінам-спонсарам тэрарызму і выказаў меркаваньне, што абвінавачаньні, высунутыя ЗША, справакаваныя зламысьнікамі Беларусі й падкопамі канкурэнтаў на рынку ўзбраеньняў. "Мы ж разумеем, — сказаў Сяргей Лінг, — што супраць нас у тэтым выпадку працуюць канкурэнты, працуюць выведкі замежных дзяржаваў... Таму што гэта барацьба за вельмі вялікія грошы..."[22].

Візыт дэлегацыі Палаты прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША, а потым Стывэна Пайфэра аналітыкі тлумачаць ня столькі заклапочанасьцю ЗША магчымымі пастаўкамі ў іншыя краіны беларускай зброі і вайсковай тэхнікі, часьцяком маральна і тэхнічна састарэлых. У першую чаргу ЗША хвалююць магчымыя пастаўкі Іраку сыстэмаў СПА С-300, сувязі ірацкіх вайскоўцаў зь беларускімі спэцыялістамі ў галіне супрацьпаветранай абароны, магчымасьць навучаньня ірацкіх спэцыялістаў у беларускіх ВНУ. Паколькі авіяцыя ЗША і іхных саюзьнікаў стала патрулюе неба Іраку, для амэрыканскага боку важна не дапусьціць узбраеньня Іраку зэнітнымі комплексамі С-300, здольнымі зьнішчаць баявыя самалёты амэрыканскага войска і флёту.

Да тэрарыстычнай атакі на ЗША 11 верасьня 2001 г. тэма беларускага гандлю зброяй не выклікала такога моцнага рэзанансу. Некалькі год беларускі экспарт зброі ішоў праз дзяржаўныя каналы краінаў-імпартэраў у адпаведнасьці зь міжнароднымі нормамі, якія рэглямэнтуюць перадачу вайсковай тэхнікі і ўзбраеньняў, і не выклікаў сур'ёзных скандалаў. Афіцыйны Менск выконваў патрабаваньні Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў для недапушчэньня паставак узбраеньняў у асобныя краіны, у дачыненьні да якіх дзеюць рэжымы санкцыяў ААН (рэзалюцыі № 661 ад 06.08.90 і № 687 ад 03.04.91). Згодна з рэзалюцыяй Генэральнай Асамблеі ААН № 46/36L ад 09.12.91, Беларусь штогод падавала зьвесткі пра свае пастаўкі ў Рэгістар звычайных узбраеньняў ААН. 9 кастрычніка 1997 г. у Беларусі быў прыняты закон аб экспартным кантролі. Апроч таго, Беларусь удзельнічала ў міжнародных акцыях для прадухіленьня і выкараненьня незаконнага гандлю стралковай зброяй і лёгкімі ўзбраеньнямі. На 38-й штогадовай канфэрэнцыі па бясьпецы, якая адбылася ў 2001 г. у Мюнхене, міністар абароны Расіі Сяргей Іваноў спэцыяльна падкрэсьліў, што ягонае ведамства ня мае зьвестак пра парушэньне міжнародных нормаў гандлю зброяй з боку Беларусі.

Вэрсію аб імкненьні ЗША прадухіліць пранікненьне беларускай зброі ў Ірак дапаўняе вэрсія аб збройным скандале як падставе для ціску на Аляксандра Лукашэнку і ягоны рэжым. Ня варта выключаць і эканамічную падаплёку скандалаў. Аднак усе гэтыя перадумовы дзеюць у комплексе. Для канкурэнтаў Беларусі на рынку ўзбраеньняў скандалы выгадныя. Разам з тым глеба для падозраньняў застаецца. Самаізаляцыя Беларусі ад супольнасьці дэмакратычных краінаў, непразрыстасьць беларускай сыстэмы ўлады для ўласных грамадзянаў і замежнапалітычныя прыхільнасьці афіцыйнага Менску заўсёды будуць пакідаць нагоду для падозраньняў у вайсковым супрацоўніцтве з тэрарыстамі й





краінамі-ізгоямі. Сярод асноўных прычынаў закрытасьці экспартнай палітыкі Рэспублікі Беларусі ў сфэры гандлю ўзбраеньнямі спэцыялісты называюць кантакты беларускіх фірмаў зь дзяржавамі, уключанымі ЗША й іншымі вядучымі краінамі Захаду ў сьпіс краінаў, якія падтрымліваюць сусьветны тэрарызм. Для расійскіх вытворцаў узбраеньняў і вайсковай тэхнікі з розных прычын выхад на рынкі гэтых краінаў забаронены ці непажаданы. Гэта Паўночная Карэя, Іран, Ірак, Судан, Емэн. Многія эспэрты мяркуюць, што Беларусь нярэдка выступае толькі ў якасьці калідору для расійскіх гандляроў зброяй.

Ускосным пацьверджаньнем гэтага меркаваньня можа служыць тое, што гандаль зброяй у Беларусі ажыцьцяўляюць фірмы, якія фармальна належаць прыватнаму капіталу. Гэта значыць дзяржава не нясе адказнасьці за іх дзеяньні. Для параўнаньня пакажам зьвесткі па Расіі. Там замежны гандаль прадукцыяй вайсковага прызначэньня дазволены толькі кампаніям, якія маюць ня менш за 51% капіталу ў фэдэральнай уласнасьці.

---

[1] Александр Алесин. На плаху МиГом? // Белорусский рынок. № 11, 12-18.03.2001 г. http://www.br.minsk.by/archive/2001-11/index.stm.

[2] Александр Алесин. Не производим, но продаем // Белорусский рынок. № 13, 03.04.2000.

[3] Тамсама.

[4] Тамсама.

[5] Александр Патутин. Секреты во вред имиджу // Белорусский рынок № 9, 02.03.1998

[6] Тамсама.

[7] Александр Алесин. Не производим, но продаем // Белорусский рынок. № 13, 03.04.2000.

[8] Станки с двойным дном // Белорусская деловая газета. № 986, 21.06.2001

[9] Тамсама.

[10] Деньги, которые не пахнут // Белорусский рынок. № 17, 30.04—6.05 2001 г. http://www.br.minsk.by/archive/2001-21/as9620.stm

[11] Стрельнуло // Белорусская деловая газета. № 1097, 18.01.2002.

[12] Тамсама.

[13] Гл. Charter97. Новости // 25 ліпеня 2001. Беларусь — крупнейший поставщик оружия и боеприпасов мусульманским экстремистам на Ближнем Востоке и Балканах. presscenter.ru

[14] Александр Алесин. Вооружения и опровержения // Белорусский рынок. № 30, 30.07.2001

[15] Владимир Денисов, Павлюк Быковский. С Багдадом все спокойно // Белорусский рынок. № 13, 26.03—1.04 2001 г.

[16] Александр Коктыш. Любимая игрушка // Свободные новости № 43, 09.11.2001.

[17] Стрельнуло // Белорусская деловая газета. № 1097, 18.01.2002.

[18] Ирак: Белоруссия и Украина продают оружие и обучают солдат? [Nuvse.com] 15.03.2002 — 20:38// http://news.central.kz/archive/country.ua.news.news/200203/17184404.html

[19] Тамсама.

[20] Америка готова ввести санкции против Беларуси // Белорусская деловая газета № 1121, 01.03.2002.

[21] Тамсама.

[22] Александр Алесин. Не пойманы, но репутация подмочена // Белорусский рынок № 9, 04.03.2002.